# ЧАЛАВЕК ВЯЛІКАГА ТАЛЕНТУ

У трэцім томе трэцяга выдання «Большой Советской Энциклопедии» на старонцы 412 змешчаны артыкул, прысвечаны нашаму земляку, 110 год з дня нараджэння якога будзе адзначаць грамадскасць нашай краіны ў гэтым годзе. У гэтых радках багатая біяграфія, яркае жыццё заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі СССР.

Блажко Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся 17 лістапада 1870 года ў мястэчку Хоцімск Магілёўскай губерні, памёр 11 лютага 1956 года ў Маскве. Савецкі астраном, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР (1929). Закончыў Маскоўскі ўніверсітэт (1892 г.), з 1910 года — дацэнт, з 1918 — прафесар.

У 1918—1931 гадах С. М. Блажко ўзначальваў Маскоўскую абсерваторыю. Асноўныя яго працы прысвечаны даследаванню пераменных зорак і практычнай астраноміі. У 1895 годзе пачаў сістэматычнае фатаграфаванне зоркавага неба кароткафокуснай камерай. У дысертацыі «Аб зорках тыпу Алголя» (1912 г.) апублікаваў першую агульную тэорыю зацямнёных пераменных зорак тыпу Алголя. Даследаваў звыш 200 пераменных зорак розных тыпаў. Адкрыў заканамерную змену крывой і перыяду бляску некаторых цэфеід (т. зв. эфект Блажко). Прапанаваў новы спосаб фатаграфавання малых планет, сканструяваў некалькі арыгінальных прылад. Сяргей Мікалаевіч Блажко — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952 г.), узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, а таксама медалямі.

Дзе б ні быў, ні працаваў наш славуты зямляк, ён ніколі не забываў аб радзіме, дзе прайшлі яго дзіцячыя і юнацкія гады. С. М. Блажко неаднаразова і ў сталым узросце наведваў Хоцімск. Як вялікую спадчыну і радасць для нас, хацімчан, мы захоўваем зробленыя ім здымкі дарэвалюцыйнай Хоцімшчыны, старонкі гісторыі роднага прыбяседскага краю. Яго імя па праву занесена ў кнігу народнай славы Хоцімшчыны.

**М. ЛАСОЎСКІ,**
бібліятэкар-краязнаўца.